Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

22 СТУДЗЕНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 12 (28122) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Хлеб — усяму галава**

СТАР. 2



**На выхадных — моцныя маразы**

СТАР. 3



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Павел ФІЛІПАЎ, начальнік упраўлення эканомікі, фінансаў і цэн Міністэрства гандлю:**

*«У цяперашняй сітуацыі цэнавых успleскаў не прадбачыцца. Калі будзе моцна павышана цана, то пакупнік проста пойдзе ў суседнюю краму і купіць тавар па цане, якая яго задаволіць. Сітуацыю стабілізуе канкурэнцыя — на спажывецкім рынку краіны прадстаўлены шырокі спектр вытворцаў і вялікі асартымент тавараў. У нас дастатковае насычэнне рынку, створана добрае канкурэнтнае асяроддзе».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.01.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 21564,00 | ▲ |
| Еўра | 23779,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 260,24 | ▲ |
| Укр. грыўня | 884,68 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# МАЙСТРЫ БОЧКІ ЎПРЫГОЖВАЮЦЬ



**Палеская вёска Багданаўка, што на Лунінеччыне, да вайны і пасля яе славілася майстрамі бондарскіх спраў. Старэйшыя багданаўскія жыхары прыгадваюць, што кожны трэці мужчына ў вёсцы займаўся гэтым старажытным рамяством. Бондарства дапамагала людзям выжываць, адбудоўваць спаленую вёску. Бочкі, цэбры і кублы, кадушкі, барылы і балеі, маслабойкі і іншы бандарны «посуд» разыходзіўся па навакольных вёсках, прадаваўся на кірмашах у Пінску і Лунінцы. Васіль КАВАЛЕВІЧ *(на фота)* з тых пасляваенных майстроў, якія і сёння працягваюць сямейную справу — выбіраць адмысловае дрэва, габляваць, падганяць клёпкі пад абручы. Акрамя яго і малодшага брата Міхаіла, у Багданаўцы ўжо не засталося сапраўдных майстроў.**

**— Мяне ў маленстве навучыў гэтаму рамяству бацька. Здаецца, што няма ў свеце лепшай справы, чым бондарства, — кажа Васіль Іванавіч. — Па-ранейшаму людзі цэняць традыцыйныя вырабы з дрэва, раз-пораз звяртаюцца да мяне з просьбамі і замовамі.**

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

***Лунінецкі раён.***

■ Круглы стол

## РАВЕСНІЦА ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

**Дзяржаўнасць — несумненны здабытак Беларусі. Яна не з'яўляецца і не даецца сама сабой. Нацыя і народ да яе вырастаюць. Аднак і пасля свайго з'яўлення дзяржаўнасць не становіцца нейкай статычнай, гарантаванай данасцю. Яна развіваецца, сталее, перажывае крызісы, пераадольвае пагрозы, адказвае на рызыкі. І для таго, каб яна мацнела, набірала вагу і забяспечвала свайму народу бяспеку і росквіт, патрэбны спецыяльна навучаныя людзі — кіраўнікі. Дзяржаўныя службоўцы і дзяржаўныя дзеячы, якія валодаюць найвышэйшымі прафесійнымі якасцямі. Менавіта такіх людзей рыхтуе ў нашай краіне ўнікальная навучальная ўстанова — Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. 29 студзеня яна будзе афіцыйна адзначаць сваё 25 гадоў, але святочныя мерапрыемствы ў Акадэміі ўжо ідуць. У сценах газеты «Звязда» з нагоды такой прыгожай даты прайшоў медыясемінар, дзе выкладчыкі і кіраўнікі акадэміі расказвалі пра яе асаблівасці і задачы сённяшняга дня.**

СТАР. 4




Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

■ Сталічнае жыллё

## ПАДЗЕННЕ ЦЭН ПРАЦЯГНЕЦЦА ДА ЛЕТА

**Аналітыкі чакаюць, што рост камунальных плацяжоў павялічыць прапанову вялікіх кватэр на рынку жылля**

**Першы месяц года падкінуў беларусам не толькі сінаптычныя сюрпрызы ў выглядзе двух моцных цыклонаў. Ужо на старце студзеня нам паведамілі аб росце камунальных плацяжоў, а жыхарам мегаполіса агучылі і новыя цэннікі на ваду, за карыстанне ліфтам і іншае. Не застаўся без увагі і кошт замежнай валюты. Разам са спецыялістамі ў сферы нерухомасці мы паспрабавалі разабрацца, як прыведзеныя фактары паўплываюць на далейшую дынаміку жыллёвых коштаў.**

### Летась — патанненне з «пераборам»

Яшчэ напачатку 2015-га наш пастаянны эксперт жыллёвай сферы — кіраўнік агенцтва «БелЦТН», старшыня савета Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай **ПРАСТАЛУПАЎ** даваў самы смелы прагноз аб патанненні за сезон на 15%. Гэты прагноз быў перавыкананы ўжо восенню, калі нерухомасць згубіла 18%, а па выніках года рынак атрымаў мінус 24%. Адразу заўважу, што дадзены трэнд на зніжэнне коштаў падлічваецца спецыялістамі ў доларавым эквіваленце. А ў рублях наша нерухомасць, магчыма, нават падаражэла...

### Бюджэтная аднапакаёўка — ад 35 тысяч долараў

Сярэдні кошт квадратнага метра аднапакаёвых кватэр у Мінску складае каля 1380 долараў. Гэтая лічба атрымліваецца пасля аналізу каталогу прапаноў.

СТАР. 3